размяркоўвае напружанасць і расслабленне ва ўспрыняцці імпліцытна пададзенага зместу.


СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Валгина, Н. С.** Теория текста: учебное пособие / Н. С. Валгина. – Москва: Логос, 2003. – 280 с.

2. **Дымарский, М. Я.** Сверхфразовый уровень организации текста / М. Я. Дымарский // Художественный текст. Структура. Язык. Стиль. – Санкт-Петербург: СПбГУ, 1993. – С. 19–37.

3. **Лосева, Л. М.** К изучению межфразовой связи (Абзац и сложное синтаксическое целое) / Л. М. Лосева // Русский язык в школе. – 1967. – № 11. – С. 89–94.

4. Современный русский язык: в 3 ч. Ч. 3. Синтаксис. Пунктуация. Стилистика / Под ред. П. П. Шубы. – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Плопресс, 1998. – 576 с.

5. **Солганик, Г. Я.** Стилистика текста: учебное пособие / Г. Я. Солганик. – Москва: Флинта; Наука, 1997. – 256 с.


УДК 37.091.3:811.161.3

***А. М. Шубадзёрава***

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ МОДУЛЬНАЙ ТЭХНАЛОГІІ Ў ВЫКЛАДАННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны актуальнай навуковай праблеме сучаснай педагагічнай навукі, звязанай з распрацоўкай і ўкараненнем у навучальны працэс новых педагагічных тэхналогій, такіх як тэхналогія модульнага навучання. Дадзеная праблема разглядаецца на прыкладзе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».
**Ключавыя словы**: інавацыйныя тэхналогіі, модульнае навучанне, блочна-модульная тэхналогія, модульна-рэйтынгавая тэхналогія, модульны метад, беларуская мова, прафесійная лексіка.

Модульнае навучанне адносіцца да ліку асобасна арыентаваных тэхналогій, якія маюць індывідуальны і дыферэнцыяваны падыход да навучання кожнага студэнта і ўлічваюць іх здольнасці, патрэбы і асаблівасці.

Такі падыход з'яўляецца дзейсным і перспектыўным пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», бо студэнты маюць розны ўзровень беларускамоўнай падрыхтоўкі, таму што вучыліся па праграмах з рознымі мовамі навучання ў агульнаадукацыйных установах. У студэнтаў, якія вучыліся ў школах з беларускай мовай навучання, багацейшы лексічны запас, яны валодаюць большымі камунікацыйнымі здольнасцямі, лепш успрымаюць інфармацыю на беларускай мове. Модульная тэхналогія ў большай

ступені, чым традыцыйныя формы навучання, дазваляе ўлічыць індывідуальны патэнцыял навучэнцаў і павысіць узровень авалодання прафесійнай лексікай.

Адна з пераваг модульнай тэхналогіі звязана з развіццём практыка-арыентаванага падыходу да навучання, які актыўна выкарыстоўваецца пры вывучэнні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».

Як паказвае практыка, засваенне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» студэнтамі, асабліва першага года навучання, выклікае цяжкасці, якія абумоўлены наступнымі прычынамі.

Першая з іх звязана з тым, што на занятках навучэнцам даводзіцца часта працаваць з тэкстамі, напісанымі прафесійнай мовай, а гэта складаная для вывучэння многафунцыянальная і многаструктурная моўная сістэма, якая мае свае асаблівасці. Для яе характэрны адметныя «функцыі (дэфінітыўная, функцыя канцэнтравання прафесійна-спецыяльных ведаў і функцыя адкрыцця новых ведаў); структурна адасобленыя сродкі выражэння (тэрміны) і спецыфічны словаўтваральны апарат (шырокае выкарыстанне абрэвіяцыі, эпаніміі і сімвала-літарна-лічбавых абазначэнняў). Такім чынам, мова спецыялістаў, функцыянуючы па агульнамоўных законах, набывае шырэйшыя семантычныя і структурныя межы і выходзіць за рамкі агульнаўжывальнай мовы, падкрэсліваючы сваю аўтаномнасць» [1, с. 11].

Для паспяховага авалодання прафесійнай мовай студэнту неабходна засвоіць новы лексічны пласт – тэрміналогію, якая з’яўляецца асноўным кампанентам тэзаўруса спецыяльнасці. Кожны тэрмін у тэксце выконвае пэўную функцыю, накіраваную на тое, каб найбольш дакладна вызначыць адпаведнае паняцце. Тэрміналагічны апарат аб’ёмны і неаднародны па сваім саставе: ён уключае тэрміны, розныя паводле сферы функцыянавання, стылістычнага выкарыстання, паходжання і інш., што ўскладняе працэс засваення прафесійнай лексікі.

Другая прычына звязана з тым, што першакурснікі (дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» часцей за ўсё выкладаецца на першым курсе) мала ведаюць пра сваю будучую прафесію і не назапасілі яшчэ дастаткова ведаў па спецыяльных дысцыплінах, а таму ім складана гаварыць на прафесійныя тэмы, абмяркоўваць вузкаспецыяльныя пытанні, з якімі яны пазнаёмяцца пазней у працэсе навучання.

Трэцяя прычына – гэта невысокі ўзровень беларускамоўнай падрыхтоўкі навучэнцаў. Авалоданне прафесійнай мовай – гэта не толькі веданне тэрмінаў, паняццяў, дэфініцый, але і ўменне ўжываць іх у працэсе камунікацыі. Для многіх студэнтаў недастатковая сфарміраванасць навыкаў вуснага маўлення (уменне выказваць свае думкі на беларускай мове) з’яўляецца сур’ёзнай праблемай. Гэта праблема сацыяльна абумоўленая: пры функцыянаванні дзвюх дзяржаўных моў сфера выкарыстання беларускай значна звужаецца. Па даных перапісу 2019 г., 70 % насельніцтва ў сямейна-бытавых умовах выкарыстоўвае

рускую мову [2]. Як заўважае Л. Ц. Выгонная, «носьбіты сумешчанага двухмоўя ведаюць, што іх ступень валодання адной з моў не адпавядае патрэбнаму для «раскаваных» зносін … таму яны пазбягаюць гаварыць на пэўнай мове … набываюць своеасаблівы комплекс «моўнай непаўнацэннасці» [3, с. 11]. Відавочна, што ў працэсе камунікацыі прадстаўнікі сучаснай моладзі, асабліва школьнікі і студэнты, аддаюць перавагу рускай мове.

Модульная тэхналогія мае магчымасці для пераадолення вышэйназваных цяжкасцей, дапамагае аптымізаваць працэс навучання па фарміраванні сістэмных ведаў, дае магчымасць выкладчыку эфектыўна арганізаваць работу па засваенні неабходнай інфармацыі, выпрацоўцы патрэбных навыкаў і ўменняў, а таксама падабраць адпаведныя формы і метады навучання для рэалізацыі пастаўленых мэт і задач.

Гэта тэхналогія абапіраецца на прынцыпы модульнасці, развіцця асобы, праблемнага навучання, матывацыі і інш. Як адзначаюць даследчыкі, «модульнае навучанне – гэта такая форма арганізацыі працэсу, пры якой вучань працуе з праграмай, якая складаецца з модуляў. Сутнасць модульнага навучання: вучань поўнасцю самастойна (альбо з некаторай дапамогай настаўніка) дасягае канкрэтных мэт вучэбнай пазнавальнай дзейнасці ў працэсе работы з модулем» [4, с. 46].

У навуковай і навукова-метадычнай літаратуры існуе шмат тэрміналагічных найменняў, у склад якіх уваходзіць слова «модуль»: модульная тэхналогія, модульны метад, модульная праграма, блочна-модульная і модульна-рэйтынгавая тэхналогіі. Аднак усе яны маюць дачыненне да методыкі, заснаванай на распрацоўцы навучальных модуляў таго ці іншага курса.

Нягледзячы на вялікую разнастайнасць дэфініцый паняцця «модуль», можна вызначыць асноўныя уласцівыя яму рысы: кожны модуль мае базавы і варыятыўны кампаненты, розныя ўзроўні засваення вучэбнай праграмы і суправаджаецца камплектам метадычных матэрыялаў. Навучальны модуль з'яўляецца крыніцай інфармацыі і метадычным кіраўніцтвам па яго засваенні.

Навучэнец, працуючы па модулі, кіруецца пэўнай інструкцыяй, у якой вызначаны: 1) мэта засваення модуля; 2) крыніцы вучэбнага матэрыялу, неабходныя для выканання модуля; 3) спосабы авалодання вучэбнай інфармацыяй (выканаць практыкаванне, перакласці тэкст, напісаць анатацыю і інш.); 4) праверка выканання прапанаваных заданняў (тэсты розных відаў, пісьмовыя работы, тэрміналагічныя дыктанты і інш). Такі кантроль дазваляе вызначыць ступень засваення навучэнцамі вучэбнага матэрыялу.

Паколькі ў навуковай і навукова-метадычнай літаратуры падрабязна апісана структура модульна-блочнай тэхналогіі, яе кампаненты, адметнасці пабудовы модуляў і іх тыпы, разгледжаны адрозненні модульнай тэхналогіі ад іншых адукацыйных сістэм, а таксама асаблівасці яе прымянення на розных ступенях навучання [5–7], звернем увагу толькі на адметнасці выкарыстання

модульнай тэхналогіі пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)».

Для найбольш эфектыўнага правядзення заняткаў па модульнай тэхналогіі неабходна ўлічваць наступныя фактары:

1) ступень падрыхтаванасці студэнтаў, узровень сфарміраванасці ў іх моўных уменняў і навыкаў, якія з'яўляюцца істотнымі пры распрацоўцы модульных заняткаў;

2) уменне навучэнцаў працаваць самастойна. Элементы модульнай тэхналогіі неабходна ўводзіць паступова, пры вывучэнні асобных тэм курса, фарміруючы тым самым навыкі самастойнай працы. Па модульнай тэхналогіі найбольш мэтазгодна, на нашу думку, праводзіць заняткі па тэмах, звязаных з вывучэннем норм беларускай літаратурнай мовы: арфаграфічных, марфалагічных, сінтаксічных і інш. Урокі-модулі дазволяць выкладчыку ўлічыць базавы ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў, забяспечыць індывідуальны тэмп навучання, падабраць аптымальную форму арганізацыі вучэбнай дзейнасці (індывідуальна, у парах, у групе і інш.);

3) спецыфіку вывучэння прафесійнай лексікі, якая ўключае некалькі этапаў: а) азнаямленне з лексічнай адзінкай (гукавое і графічнае афармленне, семантыка, граматычныя прыметы); б) засваенне (замацаванне ў памяці навучэнцаў); в) выкарыстанне тэрміна ў маўленні. Матэрыялы для модульных заняткаў павінны быць падабраны з улікам вышэйапісанай метадалагічнай сістэмы вывучэння прафесійнай лексікі.

Такім чынам, модульны падыход да навучання дазваляе максімальна індывідуалізаваць работу па засваенні новага матэрыялу, фарміраванні неабходных уменняў і навыкаў, забяспечыць паэтапную працу над прапанаванымі заданнямі і праверку правільнасці іх выканання і ў цэлым аптымізаваць вучэбны працэс.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Лубожева, Л. Н.** Роль профессиональной лексики в обогащении словарного состава общеупотребительного языка (на материале экономической терминологии английского и русского языков): дис. ... канд. филол. наук: 10.02.20 / Л. Н. Лубожева. – Челябинск, 2006. – 204 л.

2. Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ perepis-naseleniya/perepis-naseleniya-2019/infografika-i-plakaty/. – Дата доступа: 07.02.2022.

3. **Выгонная, Л. Ц.** Псіхалінгвістычныя аспекты беларуска-рускага білінгвізму / Л. Ц. Выгонная // Беларуская лінгвістыка. – 1994. – Вып. 44. – С. 10–14.

4. Інавацыйныя тэхналогіі ў мовазнаўстве і методыцы яго выкладання : метадычныя рэкамендацыі / Склад. Г. А. Арцямёнак, В. Э. Зіманскі. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2018. – 59 с.

5. **Цуркан, Н. В.** Модульные технологии обучения как составляющая современных педагогических технологий / Н. В. Цуркан, Д. В. Шведов // The Scientific Heritage. – 2020. – № 453 (45). – С. 24–27.

6. **Назаров, Р. С.** Особенности модульной технологии обучения как инновационная образовательная технология / Р. С. Назаров, Х. А. Эвазов // Вестн. Технол. ун-та Таджикистана. – 2013. – № 1 (20). – С. 65–69.

7. **Иванова, Т. А.** Возможности и преимущества модульной технологии обучения / Т. А. Иванова // Психология и педагогика: методика и проблемы практического применения. – 2010. – № 17. – С. 235–237.